2. Оценка параметров альтерации клеток эндотелиальной системы организма и оценить степень выраженности системного воспаления на фоне проводимого лучевого и (или) медикаментозного лечения у пациентов со злокачественным новообразование молочной железы с возникшими неопухолевыми осложнениями в течение периода наблюдения.

3. Оценка состояния механизмов резистентности у пациентов со злокачественными новообразованиями молочной железы, подвергшихся лучевому и (или) медикаментозному лечению и не имевших неопухолевых осложнений в течение периода наблюдения.

4. Оценка клинических особенностей протекания повреждения эндотелия с учетом возникшей формы неопухолевого осложнения, его тяжести и типа проводимого лечения у пациентов со злокачественным новообразование молочной железы, подвергшихся лучевому и (или) медикаментозному лечению.

5. Оценка состояния антиоксидантной системы организма, в процессе повреждения эндотелия и нарушения его функций, как наиболее значимых механизмов при различных формах неопухолевых осложнений у пациентов со злокачественными новообразованиями молочной железы, подвергшихся лучевому и (или) медикаментозному лечению.

***Выводы***

Разработка и внедрение лабораторных диагностических критериев и системы профилактических мероприятий, даст возможность уточнить патофизиологические механизмы возникновения эндотелий-зависимых нарушений сердечно-сосудистой системы у лиц со злокачественными новообразованиями молочной железы, подвергшихся лучевому и (или) медикаментозному лечению и повысит процент выживаемости этих пациентов, что позволит сократить трудопотери и улучшить качество их жизни.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. *Parsa, P.* Effects of reproductive factors on risk of breast cancer: a literature review / P. Parsa, B. Parsa // Asian Pacific J Cancer Prev. — 2009. — № 10. — P. 545–550.

2. Эпидемиология злокачественных новообразований в Беларуси / И. В. Залуцкий [и др.]. — Минск: Зорны верасень, 2006. — 205 с.

3. Global cancer statistics / D. M. Parkin [et al.] // CA Cancer J Clin. — 2002. — Vol. 55, Is. 2. — P. 74–108.

4. *Океанов, А. Е.* Статистика онкологических заболеваний в Республике Беларусь (2006–2015) / А. Е. Океанов, П. И. Моисеев, Л. Ф. Левин; под ред. О. Г. Суконко. — Минск: РНПЦ ОМР им. Н. Н. Александрова, 2016. — 280 с.

5. ESC Position Paper on cancer treatments and cardiovascular toxicity developed under the auspices of the ESC Committee for Practice Guidelines / Jose Luis Zamorano [et al.] // European Heart Journal. — 2016. — Vol. 37. — P. 2768–2801.

**УДК 398.8:94(100)”1939/1945”**

## ВОБРАЗНА-МАСТАЦКІЯ СРОДКІ ВЫРАЗНАСЦІ ПЕСЕНЬ ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

***Бароўская І. А.***

**Установа адукацыі**
**“Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

***Уводзіны***

Песня — гэта духоўная моц народа, без якой немагчыма было б выжыць і перамагчы ў 1941–1945 гг. З песняй ішлі ў бой, праводзілі ў апошні шлях загінуўшых сяброў, яна не давала чарсцвець душы. Вера. Надзея. Любоў. Гэта пра песню.

Гісторыя Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай — гэта гісторыя гераічнай барацьбы народа за шчасце сваёй краіны, гісторыя легендарных Канстанціна Заслонава, бацькі Міная, Рымы Шаршнёвай і шмат іншых. Менавіта на долю беларускага народа з першых гадзін вайны выпалі страшэнныя выпрабаванні. Спынілася мірнае жыццё ўсяго савецкага народа. Многія дзеячы мастацтва пайшлі на фронт або ўступілі ў партызанскія атрады. Але развіццё мастацтва не спынілася, а перайшло на іншую ступень свайго існавання — у час вайны кавалася магутная духоўная зброя, скіраваная на маральны ўздым і перамогу над фашызмам.



Репозиторий ГомГМУ

***Мэта***

Даследаваць вобразна-мастацкія сродкі выразнасці песень перыяду Вялікай Айчыннай вайны і спецыфіку іх ужывання ў тэкстах.

***Матэрыял и метады даследвання***

Пошукавы, суцэльнай выбаркі, аналітычны, апісальны.

*Вынікі даследвання і іх абмеркаванне*

Гісторыя песні гэтага перыяду пачынаецца практычна адразу пасля аб'яўлення аб нападзе гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз. У. Лебедзеў-Кумач стварыў паэтычны тэкст "Священная война", які быў пакладзены на музыку А. Аляксандравым і, як паведамляла прэса, у прыватнасці, газета «Правда», ужо 27 ліпеня 1941 г. яе развучваў Чырвонаармейскі ансамбль спеваў і танцаў. Песня загучала набатам над усёй краінай.

Гэта песня значная яшчэ і тым, што ў ёй, як у ДНК, была сабрана інфармацыя аб перспектывах і шляхах развіцця савецкай ваеннай песні на бліжэйшае паўстагоддзе. Яна стала своеасаблівым камертонам, па якім звяралася гучанне ўсёй песеннай лірыкі краіны. І вось тут мы сустракаемся з яўным парадоксам, на якія так багатае мастацтва. Пры дэталёвым даследаванні верша, пры пэўным абстрагаванні ад музыкі, што ўжо практычна немагчыма, можа падацца, што гэты твор — прыклад публіцыстычнага стылю, у якім адсутнічаюць паэтычныя тропы і стылістычныя фігуры:

*Вставай, страна огромная,*
*Вставай на смертный бой*
*С фашистской силой тёмною*
*С проклятою ордой!*

З усіх элементаў паэтыкі назіраюцца агульнамоўныя эпітэты *страна огромная, сила темная, поля просторные, землю милую.* Чаму ж сам тэкст і мелодыя так моцна ўражваюць? А прычына ў тым, што ў песні ўсё падпарадкавана адной дамінанце — абудзіць пачуццё помсты ў мільёнаў людзей, мірнае жыццё якіх раптам засталося ў далёкім мінулым. Лаканізм, мінімалізм выяўленчых сродкаў нагадваюць па форме баявы загад: стаяць насмерць!

*За землю нашу милую*
*За наш Союз большой.*
*…Встает страна огромная*
*Встает на смертный бой…*

Усім гэтым абумоўлена і інтанацыя песні, якой падпарадкавана ўся структура твора, у тым ліку і сінтаксіс, а таксама палымяны, ярасны рэфрэн, заснаваны на інверсійным парадку слоў: *за наш Союз большой, за землю нашу милую.*

У гісторыі беларускага музычна-песеннага мастацтва ў час Вялікай Айчыннай вайны адбылася спроба стварэння кантаты, асноўнай тэмай якой стала вайна, вялікая народная бітва, гераізм і мужнасць савецкіх людзей на франтах і ў тыле, нянавісць да фашыстаў. Беларускі кампазітар А. Багатыроў сваімі творамі ўнёс значны ўклад у развіццё гэтага жанру. У 1941–1942 гг. ён стварыў кантату "Беларускім партызанам", паэтычны тэкст якога быў напісаны славутым Янкам Купалам пад Масквой у верасні 1941 г. Словы імкліва распаўсюджваліся па ўсёй тэрыторыі Беларусі, перадаваліся з рук у рукі, расклейваліся лістоўкамі, чыталіся на мітынгах, друкаваліся ў партызанскіх газетах, хаваліся ў кішэнях. Паасобныя інтанацыйныя абароты набліжаюць кантату да традыцыйных беларускіх народных, асабліва рэкруцкіх, песень. Вельмі папулярнай была і песня "Беларускім партызанам", пакладзеная на музыку Р. Пукстам.

Выразна заклікальныя абароты ў зачыне мелодыі, падкрэсліванне няўстойлівых гукаў у кожнай фразе, яркія дынамічныя акцэнты, — усё гэта садзейнічае стварэнню эпічна-драматычнага, аб'ектыўнага характару напеву ў цэлым, які ахоплівае пачуцці ўсяго народа. У песні пераплецены жанравыя асаблівасці эпічнага марша і плаката-закліка, назіраецца дынаміка кульмінацыйнай напружанасці. Народна-класічныя традыцыі перадаюцца выгукамі *партызаны, партызаны!* Звяртаючыся да партызан як да сыноў Айчыны, Янка Купала заклікае адпомсціць за *цень забітых матак, дзетак, акрываўлены палетак.* Ворагаў ён не

Рэпазіторый ГомГМУ

лічыць за людзей, называе іх *гітлераўцамі паганымі, людаедамі, нечысцю, сабакамі,* якім ужо не ўваскрэснуць.

Паэтыка песні насычана стылістычнымі фігурамі. Першы і апошні куплеты ўяўляюць сабой адкрыты публіцыстычны заклік да барацьбы, што перадаецца паўторамі лексемы *партызаны*. Свае эмацыйныя адносіны паэт выражае праз перыфразу, якая найчасцей выступае вынікам індывідуальна-мастацкага бачання свету: *Партызаны, партызаны. Беларускія сыны!*

Заклік вынішчаць, *рэзаць* ворагаў узмацняецца паўторамі прыназоўнікаў, у прыватнасці прыназоўніка *за*, што ўзмацняе душэўныя боль і крыўду: *За няволю. за кайданы Рэжце гітлерцаў паганых, Каб не ўскрэслі век яны.*

З мэтай узмацнення выразнасці, усхваляванасці, у песні назіраецца інверсія, пры якой на першае месца выносяцца словы з найбольш важным сэнсавым зместам: *Клічу вас я на пабеду, Хай вам шчасцем свецяць дні.*

Сутнасць інверсіі заключаецца ў парушэнні агульнапрынятай паслядоўнасці адзінак маўлення «з мэтай узмацніць выразнасць мовы» [1, с. 300].

Узмацненню эмацыянальнага выказвання, яго танальнасці, аб'ядноўваючы пры гэтым пэўныя радкі, садзейнічае гукавая анафара:

***Н****яхай ваша перамога*
***Не*** *кідае вас нідзе,*
***Не*** *пужае хай трывога.*

Неабходна адзначыць, што вершы Янкі Купалы адразу ператвараліся ў песні і выконваліся на розныя матывы ў розных кутках краіны.

3 снежня 1942 г. 18 юнакоў каля вёскі Лавы Капыльскага раёна абаранялі важны рубеж, прыкрываючы адыход партызанскага шпіталю. Калі скончыліся патроны, байцы напісалі запіскі "Просім лічыць нас камсамольцамі" і загінулі ў няроўным баі. Гэты гераічны подзвіг глыбока ўсхваляваў сяброў па барацьбе, а потым і ўсю краіну. Паўсюдна ствараліся разнастайныя тэксты, спяваліся яны ў розных партызанскіх атрадах. Так, напрыклад, вядома песня Адама Русака "Лаўскі бой" (музыка Л. Свердзеля): *Збіраліся хлопцы ў Лаўскім бары, У пушчы трывожнай гарэлі кастры. Пра слаўных герояў, пра Лаўскі паход Легенды і песні складае народ.*

Усхваляванасць у радку перадаецца аўтарскай перыфразай (*свінцовыя буры*), а метафарызаваны вобраз ворага, які запаўняе павольна ўсё наваколле і не пакідае надзеі на светлую перамогу, перадае няроўнасць сіл і трывожны настрой, прадбачлівую гібель 18 юнакоў:

*Свінцовыя буры над краем гулі,*
*І чорнаю зграяй чужынцы паўзлі.*
*З няроўнаю сілай сустрэўся атрад*
*І хлопцы сказалі: «Ні кроку назад!»*

Песні пра герояў вайны былі вельмі распаўсюджанымі ў тыя часы: яны адлюстроўвалі мужнасць, пабуджалі на новыя подзвігі. Трагедыя вядомага бацькі Міная натхніла А. Куляшова на стварэнне «Балады аб чатырох заложніках». Зачын твора стварае інтанацыйна запаволенае ўспрыняцце падзей. Паўзы паміж аднасастаўнымі словамі-сказамі — нібы вечнасць перад гібеллю:

*Іх вядуць па жытняй сцяжынцы*
*Чатырох. Пад канвоем. З дому.*

Даволі значная група песень была створана на яркія паэтычныя тэксты беларускіх паэтаў: Янкі Купалы, П. Глебкі, М. Танка, К. Крапівы, М. Машары, А. Астрэйкі і іншых.

Песні беларускіх паэтаў і кампазітараў, напісаныя ў гады вайны, прасякнуты гнеўнай нянавісцю да ворага і моцнай верай у перамогу: «Мы вернемся» М. Танка, «За родную Беларусь» А. Астрэйка і шмат іншых. Вялікая колькасць песень прысвячалася партызанам Беларусі: «Калі над радзімай» П. Броўкі, «Помню, помню тыя росы» К. Крапівы, «Песня партызан», «Клятва партызан» А. Бялевіча, «Праз лясы, балоты і паляны» М. Танка і іншыя.

***Заключэнне***

Песні ваенных гадоў сталі ля вытокаў такога свяшчэннага паняцця як Песня Вялікай Айчыннай вайны. Яны прадвызначылі ўвесь далейшы накірунак эвалюцыі беларускага мастацтва.

Рэпазіторый ГомГМУ

Шмат песняў было створана пасля вайны, складаюцца яны і ў наш час. Але менавіта тэксты тых апаленых ваенных гадоў застануцца ў нашай памяці сведкамі таго часу, як найвышэйшая кропка майстэрства і таленту народа-пераможцы.

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Розенталь, Д. Э.* Практическая стилистика русского языка: учебник для вузов / Д. Э. Розенталь. — М.: Высш. шк., 1977. — 362 с.

**УДК 616.155.194.18+616.155.194.74]-092-06-053.2-056.24**

## ПАТОЛОГИЯ, УСУГУБЛЯЮЩАЯ ОГРАНИЧЕНИЕ ЖИЗНЕДЕЯТЕЛЬНОСТИ У ДЕТЕЙ С ГЕМОЛИТИЧЕСКИМИ И АПЛАСТИЧЕСКИМИ АНЕМИЯМИ

***Бартось В. Н.***

**Государственное учреждение**
**«Республиканский научно-практический центр**
**медицинской экспертизы и реабилитации**
**п. Городище, Республика Беларусь**

***Введение***

Анемический синдром является наиболее частой цитопенией среди любой возрастной популяции. И если группа дефицитных анемий не представляет серьезной угрозы в плане отдаленных последствий для здоровья ребенка, то такие анемии как апластические и гемолитические могут служить основой утраты некоторых важных функций и ухудшения повседневной жизнедеятельности пациента. Распространенность сопутствующей патологии у пациентов с анемиями на момент постановки диагноза составляет по разным данным 97,4 % [1–3].

***Цель***

Изучить патологию, усугубляющую ограничение жизнедеятельности при анемическом синдроме.

***Материал и методы исследования***

Было проведено клинико-функциональное и клинико-экспертное обследование 39 детей в возрасте от 1 года до 18 лет (59 ± 7,9 % мальчики и 41 ± 7,9 % девочки) с цитопеническим синдромом вследствие анемии.

Для оценки полученных результатов применялись методы описательной статистики: абсолютное число, относительная величина (p), стандартная ошибка относительных величин ($m_p$).

***Результаты исследования и их обсуждение***

В ходе анализа установлено, что наиболее часто (61,5 ± 7,8 %) встречаемой патологией у детей с анемическим синдромом являлись гемолитические анемии (ГА). Несколько реже (37,5 ± 7,8 %) к анемическому синдрому приводили апластические анемии (АА).

Среди сопутствующей патологии у пациентов с ГА случаи болезней и патологических состояний эндокринной системы и нарушения обмена веществ выявлены у 37,8 ± 10,1 %, из числа которых доминировал гиперкортицизм (44,5 %) и у 67 ± 12,6 % детей с АА, среди которых преобладало ожирение (30 %).

Среди детей с ГА сопутствующие болезни и патологические состояния органов пищеварения отмечались у 50 ± 10,4 % детей, из числа которых в 66,7 % случаев доминировала желчнокаменная болезнь (ЖКБ), ау пациентов с АА ЖКБ встречалась только в 20,1 ± 10,7 %, из числа которых в 100 % был хронический гастрит. Это обусловлено тем, что ЖКБ имеет высокий риск развития при гемолитических анемиях, обусловленный длительно персистирующей гипербилирубинемией.

У 25,2 ± 9,1% детей с ГА отмечались болезни и патологические состояния нервной системы (из них 33,3 % случаев — вегето-сосудистая дистония), а у детей с АА данная сопутствующая патология встречалась только в 1 (6,7 ± 6,7 %) случае.

Болезни и патологические состояния системы кровообращения отмечались у 25,2 ± 9,1 % детей с ГА (среди которых преобладали (83,3 %) малые аномалии сердца), и у 13,4 ± 9,1 % детей с АА (в 100 % случаев — нарушение ритма и проводимости сердца).

Репозиторий ГомГМУ